ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



КРАСАВІК

Віцебск 2014

**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Красавік**

*Інфармацыйнае паведамленне*

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”

Аддзел бібліятэказнаўства

**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Красавік**

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК

2014

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : красавік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – 24 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, 2014

**22 красавіка** ў абласной філармоніі адбыўся канцэрт музыканта і спевака, ураджэнца Лепельшчыны, аўтара песні ”Чарка на пасашок” *Аляксандра Балотніка* (тры гады назад вярнуўся са ЗША, дзе пражыў 12 гадоў).

*Витебские вести. – 2014. – 10 апр. – С. 24.*

*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

**14–15 красавіка** на сцэне Нацыянальнага тэатра імя Я. Коласа прайшлі традыцыйныя сцэнічныя чытанні “Школьный театр-18”. Галоўны прыз атрымала ўзорная тэатральная студыя “Взрослые дети” гімназіі № 8 (кіраўнік *А. Раманава*) за спектакль “Казка на ноч” па творы А. Масла “Палярная зорка”. Першае месца падзялілі ўзорны тэатральны калектыў “ТэСт” СШ № 4 за спектакль “Уверх па лесвіцы, якая вядзе ўніз” Бэл Каўфман і школьны тэатр СШ № 28 за пастаноўку “Сваякі” па апавяданні В. Быкава.

*Витебские вести. – 2014. – 26 крас. – С. 16.*

З **18** па **21 красавіка** Беларускагі тэатр “Лялька” святкаваў свой дваццаць восьмы дзень нараджэння. Артысты падрыхтавалі разнастайныя забаўляльныя праграмы для дзяцей і дарослых.

"Вытокі" (карціны, тканыя і вышываныя дываны, ручнікі і паясы).

*Витебские вести.– 2014. – 3 апр. – С. 23.*

З **15 красавіка** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці працавала абласная пасхальная выстаўка работ "Велікодная радасць", удзел у якой прынялі ўсе дамы рамёстваў вобласці.

*Віцебскі АМЦНТ*

*КІНАМАСТАЦТВА*

**3 красавіка** ў Віцебску ў Доме кіно адбылася прэм'ера фільма Аляксандра Міты "Шагал – Малевіч". На яе разам з рэжысёрам прыехалі выканаўцы галоўных роляў Марка і Бэлы – *Леанід Бічэвін* і *Крысціна Шнайдэрман*.

*МУЗЫКА*

У г. Наваполацку ў трэці раз прайшоў адкрыты міждзяржаўны конкурс юных піяністаў "Музычная лілея", які сабраў 47 удзельнікаў з Беларусі, Расіі і Латвіі. Дыпломы І ступені журы конкурсу прысудзіла *Анастасіі Шымчак* з г. Мінска, *Кірылу Атрошчанку* з г. Оршы і навучэнцу дзіцячай музычнай школы пры Наваполацкім музычным каледжы *Мікіце Куляшову*.

*Витебские вести. – 2014. – 3 мая. – С. 24.*

**16 красавіка** на Лядовай арэне ў г. Оршы выступіў нарвежскі спявак і скрыпач з беларускімі каранямі *Аляксандр Рыбак.*

У г.п. Барань прайшоў традыцыйны фестываль юных інструменталістаў "Музыкальная капель", удзел у ім прынялі каля 100 юных музыкантаў з усёй рэспублікі. У гэтым годзе з'явілася новая намінацыя "прэм'ерліга", у якой удзельнічалі толькі лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.

*Витебские вести. – 2014. – 12 апр. – С. 16.*



**ЗМЕСТ**

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………….4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне…………………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

“Культурнае жыццё Віцебскай вобласці” – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка “Хроніка падзей” уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 30 красавіка 2014 года. “Хроніка падзей” таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Дубровенскай, Лепельскай, Пастаўскай, Полацкай, Сенненскай, Ушацкай, Чашніцкай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай гарадской сеткай бібліятэк.



З **18 красавіка** ў Мастацкай галерэі г. Полацка праходзіла персанальная выстаўка работ мастачкі з г. Гомеля *Святланы Курашовай* (акварэль).

*http://polotsk.museum.by/node/35301*

У **красавіку** ў Полацкім цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі работ мастака *Віктара Казіміравіча Любавіцкага* “Мастацтва – маё жыццё”, прымеркаванай да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

*Полацкі веснік. – 2014. – 4 крас. – С. 15.*

Выстаўка твораў мінскіх мастакоў *Маргарыты* і *Уладзіміра Голубевых* пад назвай “АнтыкварыART” адкрылася ў красавіку ў Мастацкай галерэі г. Полацка (батык, жывапіс, дызайнерскія праекты).

*Полацкі веснік. – 2014. – 25 крас. – С. 7.*

### *ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

“Божы свет вачыма дзяцей” – так называецца выстаўка-конкурс дзіцячай дэкаратыўна-прыкладной творчасці, якая праходзіла ў Культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна»” з **18 красавіка** па **2 мая**, у рамках абласнога велікоднага свята “XII Велікодны Фестываль у г. Віцебску”.

Творчы клубны праект “Грані” народнага клуба “Рошва” з г. Полацка быў удастоены Гран-пры II адкрытага Міжнароднага фестывалю ласкутнага шыцця “Квілт-Фэст” у г. Маскве.

Да **12 красавіка** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці працавала выстаўка работ народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў Шумілінскага Дома рамёстваў.

*Віцебскі АМЦНТ*

У Культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна»” дэманстравалася выстаўка работ клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору

У Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я ў **красавіку** адбылася сустрэча з кандыдатам мастацтвазнаўства, дацэнтам кафедры этнаграфіі і фальклора УА "БДУКМ" *Вольгай Лабачэўскай*. Мерапрыемства прысвячалася традыцыйнаму ручному ткацтву на Беларусі.

*Полацкі веснік. – 2014. – 3 мая. – С. 2.*

Напярэдадні 600-годдзя г. Глыбокае на плошчы 17 Верасня ўстанавілі манументальна-дэкаратыўную скульптуру "Иисус и самаритянка". Над увасабленнем біблійскага сюжэта працаваў скульптар, член беларускага Саюза дызайнераў *Вячаслаў Далгоў*.

*Витебский проспект. – 2014. – 3 мая. – С. 15.*

Дабрачынную акцыю "Протяни руку помощи детям" арганізаваў конны клуб "Живой восторг" пры падтрымцы Дзіцячага музея – філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка для выхаванцаў Полацкага сацыяльнага прытулку і Наваполацкага дзіцячага дома.

*Витебские вести. – 2014. – 3 апр. – С. 16.*

## МАСТАЦТВА

### *ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

У Мастацкім музеі адкрылася выстаўка работ выхаванца Віцебскага дзіцячага дома *Дзяніса Селязнёва* "Дебют" (акварэль, пастэль, гуаш і інш.). Экспазіцыя адбылася ў рамках дабрачыннага праекта Мастацкага музея "Дари добро", які прадастаўляе магчымасць усім выхаванцам дзіцячых дамоў Прыдзвіння наведаць выставачную залу.

*Витебский проспект. – 2014. – 10 апр. – С. 16.*

Выстаўка работ латвійскай мастачкі *Ірыны Цірэ* адкрылася ў Мастацкім музеі г. Віцебска. У экспазіцыі прадстаўлены чорна-белыя фатаграфіі і графічныя лісты, выкананыя ў розных жанрах: партрэт, пейзаж і нацюрморт.

*Витебские вести. – 2014. – 3 мая. – С. 23.*





# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

## КУЛЬТУРА

### АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

За дасягненне ў 2013 годзе  найлепшых вынікаў на абласную Дошку гонару ў намінацыі "культура" занесены Цэнтр культуры "Віцебск".

*Витебские вести. – 2014. – 3 мая. – С. 1, 4.*

Дырэктар Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў імя А. Тызенгаўза *Анатоль Анатольевіч Собаль* узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

*Витебские вести. – 2014. – 15 апр. – С. 4.*

### *АГРАЭКАТУРЫЗМ*

Прадстаўнікі турыстычнай сферы Полацкага раёна прынялі ўдзел у рабоце Міжнароднага веснавога кірмашу турыстычных паслуг "Отдых-2014" у г. Мінску. У час мерапрыемства былі дасягнуты дамоўленасці з польскімі, латышскімі і літоўскімі прадстаўнікамі з нагоды прыёму турыстаў.

*Витебские вести. – 2014. – 26 апр. – С. 9.*

### *КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

**2 красавіка** ў г.п. Лёзна адбылася сустрэча гасцей з Ельнінскага і Руднянскага раёнаў Смаленскай вобласці. Сустрэчы ў Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі сталі традыцыяй у гэтых прыгранічных раёнах. Госці пабывалі ў Доме культуры в. Новае Сяло, азнаёміліся з экспазіцыяй Лёзненскага ваенна-гістарычнага музея, аддалі даніну памяці загінуўшым салдатам Вялікай Айчыннай вайны на афіцэрскіх могілках у в. Стасева. Завяршылася мерапрыемства сумесным канцэртам мастацкай самадзейнасці ў РДК.

*Витебские вести. – 2014. – 1 апр. – С. 2.*

**2 красавіка** у г. Оршы быў падпісаны дагавор аб асноўных напрамках супрацоўніцтва паміж Аршанскім раёнам Віцебскай вобласці і муніцыпальным утварэннем "Кардымаўскі раён" Смаленскай вобласці. З гэтай нагоды ў гарадскім Цэнтры культуры адбыўся святочны канцэрт, удзел у якім прынялі ўзорная арт-група "Натхненне", народны ансамбль народнай песні "Славяначка", узорны ансамбль танца "Ві-За-Ві" і іншыя, а таксама артысты Смаленскай вобласці.

*Аршанская газета. – 2014. – 8 крас. – С. 2.*

Выхаванцы ўзорнай студыі эстраднай песні "Форум" ДУ "Цэнтр культуры «Віцебск»" сталі ўдзельнікамі IV Міжнароднага фестывалю "Talent show", які праходзіў з **14** па **18 красавіка** на круізным караблі "Romantika" (Рыга–Стакгольм–Рыга). Спецыяльныя прызы атрымалі *Уладзіслава Бурнова*, *Ева Клюева*, *Марыя Лепшанкова*, *Максім Арлоўскі*, *Дзяніс* і *Мікіта Ціво*. І месца занялі *Яўгенія Дарожкіна*, *Аліна Чарноўская*, а таксама вакальныя студыі "Звездочки" і "Домисоль". ІІ месца атрымаў *Сяргей Кухарэнка*, І месца ва ўзроставай катэгорыі 8–9 гадоў з беларускай народнай песняй заваявала *Вераніка Юхнавец*.

*http://www.gck.by/2014/04/%D1%81%D1%82*

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА.
## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца "Лявоніха" **24 красавіка** запрасіў усіх аматараў народнага мастацтва, культуры і харэаграфіі ў КЗ "Віцебск" на святочнае мерапрыемства, прысвечанае свайму 60-годдзю.

У Цэнтры культуры "Віцебск" распрацаваны фірменны стыль XXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Асновай для мастацкага ўвасаблення стылю фестывалю 2014 года ў друкаванай і відэапрадукцыі нязменна з'яўляецца таварны знак фестывалю. У гэтым годзе яго элементы дапоўнены каляровай гамай, у



пазнавальная гульня "Кніжныя гісторыі", дзень гумару "Падарожжа ў Хахатанію" з гульнёвай праграмай "Красавіцкая гумарына" і гумарыстычная вечарына "Улыбка и смех – это для всех", дзень экалогіі "Весь шар земной – один прекрасный дом" з інфармацыйна-пазнавальнай гадзінай "За верность и преданность" і медыяпадарожжам "Гартаючы старонкі Чырвонай кнігі", тэатралізаванае прадстаўленне "Падарожжа ў свет кнігі" (*дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы*).

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**1 красавіка** Конкурсная праграма "Апрельская юморина" для вучняў 4 "В" класа СШ № 1 (*дзіцячая бібліятэка*).

**2 красавіка** Тэматычная сустрэча "Сіла – у адзінстве", прысвечаная Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. На мерапрыемства былі запрошаны жыхары райцэнтра, прадстаўнікі прадпрыемстваў, грамадзянскіх аб'яднанняў (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**6 красавіка** Гульня-экскурсія "Сюда приходят дети узнать про все на свете" (*Светласельская сельская бібліятэка*).

**12 красавіка** Літаратурная сустрэча з пісьменнікам, журналістам *М.А. Марозам* "Праца пісьменніка – тое жытнёвае поле, на якім расце і колас, расце і пустазелле", прэзентацыя кнігі "Не маючы сілы" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

*МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ*

У г. Віцебску ў красавіку адбылася прэзентацыя "Музея шакалада", экспазіцыя адкрылася ў Мастацкім музеі.

*Витебские вести. – 2014. – 3 мая. – С. 23.*

Упершыню ў г. Лепелі пачалася рэалізацыя праекта "Рэгіёны Беларусі: Віцебшчына". У мясцовым краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка, на якой прадстаўлены экспанаты адразу з трох раёнаў – Лепельскага, Чашніцкага і Аршанскага.

*Витебские вести. – 2014. – 3 апр. – С. 15.*

Круглы стол “Я выбіраю будучыню” (*Пламенская сельская бібліятэка*).

Інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Дороги, которые мы выбираем” (*Багушэўская гарпасялковая бібліятэка*).

Свята “Пасхальная вясна ў бібліятэцы”, у рамках якога адбыліся наступныя мерапрыемствы: кніжная выстаўка “Светлае Хрыстова Уваскрэсенне”, выстаўка-прагляд “Біблія – дзецям”, гучнае чытанне па кнізе “Светлае Хрыстова Уваскрэсенне”, сустрэча з настаяцелем Свята-Мікалаеўскай царквы, спектакль “Новая сказка про Красную Шапочку” (*дзіцячая бібліятэка*).

Ва ўсіх бібліятэках Сенненскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы былі аформлены кніжныя выстаўкі: “Чарнобыль – боль беларускага народа”, “Чарнобыльскі боль – напамін пакаленняў”, “Палескі смутак”, гадзіна-рэквіем “Место подвига – Чернобыль” (*цэнтральная раённая бібліятэка),* гадзіна памяці “Горькое эхо Чернобыля” (*Сінягорская сельская бібліятэка*).

### *Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

У рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі адбыліся наступныя мерапрыемствы: літаратурнае свята “С книгой мир добрей и ярче”, тэатралізаваная прагулка ў казачную краіну “Хохотания”, лялечны спектакль “Петя и лиса”, экавандроўка “Цікавыя сустрэчы на птушынай дарозе” і інш. (*дзіцячая бібліятэка*).

Музычная гадзіна “Рок-н-ролл навсегда” (*Іллюшынская сельская бібліятэка*).

Урок правазнаўства “Твой выбор сегодня – гарантия будущего” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

### *Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк*

У рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі “Я свет адкрываю кніжнай старонкі” прайшлі наступныя мерапрыемствы: літаратурна-



якую ўваходзяць сакавітыя неонавыя колеры. Аўтарам фірменнага стылю фестывалю з'яўляецца мастак-дызайнер Цэнтра *Дар'я Волкава.*

*http://www.gck.by/category/news/*

**26 сакавіка** на сцэне КЗ “Віцебск” адбыўся творчы вечар “Живой” народнага тэатра-студыі сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанка.

*Витебский проспект .– 2014. – 3 апр. – С. 16.*

**28–30 красавіка** адбыўся XX Міжнародны фестываль яўрэйскіх маладзёжных клубаў “Пуримшпиль в Витебске”.

*Витебский проспект. – 2014. – 5 апр. – С. 16.*

У Палацы творчасці дзяцей і моладзі ў **красавіку** адбылася акцыя для дзяцей-інвалідаў з малазабяспечаных сямей Віцебска, дзяцей-сірот з Сенненскай школы-інтэрната і шматдзетных сямей ”Дари свою любовь на Пасху!”. Свята атрымалася дзякуючы падтрымцы дабрачынныга Фонду духоўнага адраджэння.

*Витебские вести. – 2014. – 26 апр. – С. 16.*

### *ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

У **красавіку** працягваліся канцэрты **XXVII Міжнароднага фестывалю старажытнай і сучаснай камернай музыкі** ў г. Полацку, які будзе доўжыцца да 2 мая.

**5 красавіка** адбыўся штогадовы **конкурс эстраднай песні “Пастаўскія зорачкі”**. Сёлета ёні адбыўся ў новым фармаце: два фестывалі “Пастаўскія зоркі” і “Пастаўская зорачка” аб’ядналіся ў адзін. Сярод самых маленькіх (7–9 гадоў) перамагла *М. Шаура*. Журы на II і III месца прызначыла па некалькі намінантаў. Гран-пры ва ўзроставай катэгорыі 10–13 гадоў узяла *М. Лібоза*, сярод вакальных груп – ансамбль “Паветруля” (Навасёлкаўская дзіцячая школа мастацтваў). Першае месца сярод канкурсантаў, старэйшых за 14 гадоў, – у *М. Сеганкевіч*.

*Витебские вести. – 2014. – 12 апр. – С. 16.*

**5 красавіка** ў г. Глыбокае прайшло **абласное свята-конкурс “Тэатральная вясна-2014”**, прысвечанае 70-годдзю вызвалення Беларусі

ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (Глыбоцкая зона).

Дыплом I ступені атрымаў заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр “Пілігрым” ГДК г. Полацка (рэжысёр-пастаноўшчык *Вера Кісялёва*).

Пераможцамі ў розных намінацыях сталі:

**намінацыя “драматычны спектакль”:**

дыплом I ступені – народны тэатр “Пошук” Лепельскага ГДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Віталь Хватынец*);

дыплом II ступені – народны тэатр Докшыцкага ГЦК (рэжысёр-пастаноўшчык *Ганна Яцкоўская*),

дыплом III ступені – народны тэатр Браслаўскага РДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Яўген Набееў*), народны тэатр Міёрскага РДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Аляксей Гайдэль*);

**намінацыя “малыя тэатральныя формы”**:

дыплом I ступені – народны тэатр “Час” Наваполацкага ГДК (рэжысёр-пастаноўшчык і выканаўца *Сяргей Лыскоў*);

дыплом II ступені – народны тэатр Браслаўскага РДК (рэжысёр-пастаноўшчык і выканаўца *Яўген Набееў*);

дыплом III ступені – народны юнацкі тэатр мініяцюр “Зборная нашага горада” Верхнядзвінскага РДК (кіраўнік *Вольга Мароз*).

Дыпломы па дадатковых намінацыях:

“За лепшую рэжысуру” – рэжысёр-пастаноўшчык *Вера Кісялёва* (заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр “Пілігрым” ГДК г. Полацка);

“За лепшую сцэнаграфію” – народны тэатр Міёрскага РДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Аляксей Гайдэль*);

“За лепшае музычнае афармленне” – народны тэатр “Пошук” Лепельскага ГДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Віталь Хватынец*);

“За сінтэз розных жанраў мастацтва” – заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр “Пілігрым” ГДК г. Полацка (рэжысёр-пастаноўшчык *Вера Кісялёва*);



сустрэчы адбылася прэзентацыя рукапіснага акафіста прападобнай Еўфрасінні Полацкай (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

**9 красавіка** Партрэт вядомай асобы “Есть целый мир в душе моей….”. Госцем бібліятэкі стаў мастак, ветэран Вялікай Айчыннай вайны *Віктар Казіміравіч Любавіцкі* (*бібліятэка імя Я. Купалы*).

**19 красавіка** Віртуальнае падарожжа “Сакральная Полаччына”, прымеркаванае да 90-годдзя Полацкага раёна (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

**22 красавіка** Пазнавальна-забаўляльная экскурсія “Книжное царство, журнальное государство” для выхаванцаў дзіцячага сада № 2 (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*).

Сустрэча “Да Перамогі ішлі цаной жыцця…” навучэнцаў Полацкага кадэцкага вучылішча з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, малалетнім вязнем канцлагера, падпалкоўнікам у адстаўцы *Сямёнам Кліментавічам Фейгельманам* (*бібліятэка-філіял № 9*).

### *Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк*

Да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ў бібліятэках сістэмы адбыліся гістарычны экскурс “Связанные одной судьбой” (*Машканская сельская бібліятэка*), урок дзяржаўнасці “Саюз брацкіх народаў” (*Чырвонасельская сельская бібліятэка*) і інш.

Тэме выбара прафесіі была прысвечана сустрэча з удзелам інспектара групы ідэалагічнай работы кадравага забеспячэння Сенненскага РАПС, начальніка аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Сенненскага раённага выканаўчага камітэта, карэспандэнта газеты “Голас Сенненшчыны”, фармацэўта-рэцэптара, правізара-рэцэптара аптэкі г. Сянно (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

Завочнае падарожжа “Маладыя ў сельскай гаспадарцы” (*Машканская сельская бібліятэка*).

рамках акцыі "Прочти книгу о войне – стань ближе к подвигу" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**21 красавіка** Літаратурны відэакалаж "Книжное царство – мультяшное государство" (*дзіцячая бібліятэка*).

**25 красавіка** Вечар памяці "Чарнобыль: памяць і боль" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**25 красавіка** Тэматычны вечар "Калі сям'я разам, то на душы спакой" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**26 красавіка** Экагадзіна "Чернобыльская рана" (*Бароўская сельская бібліятэка*).

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

*Пастаўская дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі* правяла ў **красавіку** Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі. У рамках Тыдня адбыліся:

**21 красавіка** Ранішнік для вучняў 1–4 класаў "С героями сказки будет интересней";

**22 красавіка** Адкрыты прагляд кніг "Нам памяці звоняць званы", прысвечаны перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.;

**23 красавіка** Экалагічны турнір "Берагчы свой дом, сваю планету" для вучняў 8-х класаў;

**24 красавіка** Лялечнае прадстаўленне "Путешествие в Лукоморье" па казках А.С. Пушкіна для вучняў 3-х класаў;

**25 красавіка** Завочная экскурсія "Мілей цябе няма, мой добры горад".

**15 красавіка** Віртуальнае падарожжа "Прыйсці да вечнага агню" да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін (*Варапаеўская гарпасялковая бібліятэка*).

**Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк**

**2 красавіка** Духоўна-асветніцкая сустрэча "Живой источник духовности" з насельніцамі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. У час



"За лепшы акцёрскі ансамбль" – народны юнацкі тэатр мініяцюр "Зборная нашага горада" Верхнядзвінскага РДК (кіраўнік *Вольга Мароз*);

"За лепшую мужчынскую ролю" – *Васіль Матырко* (народны тэатр "Пошук" Лепельскага ГДК);

"За лепшую жаночую ролю" – *Ірына Кірыенка* (народны тэатр Докшыцкага ГЦК);

"За творчы дэбют" – *Алеся Папко* (народны тэатр "Пошук" Лепельскага ГДК).

**Выстаўка тэатральнага касцюма "Вобраз? Сучаснасць... Тэатр!"**:

дыплом "За ўдзел" – народны тэатр Міёрскага РДК;

дыплом "За ўдзел у дабрачыннай акцыі «Пасылка фронту»": народны юнацкі тэатр мініяцюр "Зборная нашага горада" Верхнядзвінскага РДК, народны тэатр "Пошук" Лепельскага ГДК, народны тэатр Міёрскага РДК, народны тэатр Докшыцкага ГЦК.

*Віцебскі АМЦНТ*

**13 красавіка** ў Віцебскай абласной філармоніі адбыўся гала-канцэрт, які завяршыў **Міжнародны фестываль танца "Калейдаскоп"**. Фестываль, прысвечаны трайблу, усходнім і індыйскаму танцам, праходзіў у Віцебску 12–13 красавіка. У яго рамках адбыліся два конкурсы: "Oriental Kaleidoscope" для выканаўцаў belly dance і "Indian Kaleidoscope" – для танцораў індыйскага танца стылю "Балівуда". Канкурсанты прадстаўлялі Беларусь, Егіпет, Індыю, Расію, Славенію і Украіну.

*http://news.vitebsk.cc/2014/04/14/festival-vostochnyih-tantsev-v-vitebske-zavershilsya-gala*

**VIII Рэспубліканскі турнір па спартыўных бальных танцах "Танцевальный ринг-2014"** прайшоў на базе Віцебскага цэнтральнага спартыўнага комплексу. Яго арганізатарамі выступілі Беларуская федэрацыя танцавальнага спорту і танцавальны клуб "Аэліта", выхаванцы якога сталі фаварытамі конкурсу.

*Витебские вести. – 2014. – 26 апр. – С. 16.*

*БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

По выніках абласнога тура XXII рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры" за 2013 год пераможцамі (згодна загада Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі № 41 ад 14.03.2014 г.) прызнаны наступныя бібліятэкі:

– у намінацыі **"За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем"**:

Лепельская цэнтральная раённая бібліятэка (дырэктар *Тарасава Ірына Уладзіміраўна*),

Якубаўшчынская сельская бібліяэка Лёзненскай раённай сеткі публічных бібліятэк (бібліятэкар *Кірылкіна Ганна Мікалаеўна*),

– у намінацыі **"За пошукавую і даследчую працу"**:

Дубровенская цэнтральная раённая бібліятэка (дырэктар *Фарэйтарава Наталля Мікалаеўна*),

Дабейская сельская бібліятэка Шумілінскай раённай сеткі публічных бібліятэк (*бібліятэкар Бубен Ала Мікалаеўна*),

– у намінацыі **"За падтрымку і развіццё чытання"**:

Відзаўская гарпасялковая бібліятэка Браслаўскай раённай сеткі публічных бібліятэк (бібліятэкары *Мачан Людміла Спірыдонаўна, Кандратовіч Галіна Іванаўна*).

***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**7 красавіка** ў бібліятэцы прайшоў Дзень здароўя "Мы выбираем здоровый образ жизни", прымеркаваны да Міжнароднага дня здароўя. У фае была арганізавана выстава-прагляд літаратуры аддзела абанемента "К здоровью с книгой", прадстаўлены экспанаты выстаўкі-прэзентацыі "Утверждение трезвости в современном мире" Віцебскага епархіяльнага брацтва "Трезвение" (старшыня *В.У. Вінакураў*), бібліяграфічны агляд выданняў з фонду аддзела абанемента "Слагаемые здоровья" для членаў клуба сталых людзей "Сяброўства" пры Першамайскім савеце ветэранаў і "Золотой возраст" пры Першамайскай раённай арганізацыі Беларускага



таксама сустрэча супрацоўнікў аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дубровенскага райвыканкама з калегамі з Краснінскага раёна Смаленскай вобласці (Расійская Федэрацыя), на якой былі абмеркаваны актуальныя пытанні сферы культуры;

сустрэча-інтэрв'ю з пісьменнікам *Юрыем Татарынавым* "История на страницах книг" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

Да Міжнароднага дня дзіцячай кнігі: тэатралізаванае прадстаўленне "Удивительные встречи" (*дзіцячая бібліятэка*), свята кнігі "Путешествие в Изумрудный город" (*сельская бібліятэка аграгарадка Ляды*), літаратурная віктарына "Весна. Каникулы. Книжный праздник" (*сельская бібліятэка аграгарадка Сваташыцы*), свята "Кніга збірае сяброў" (*сельская бібліятэка аграгарадка Буда*) і інш.

Да Міжнароднага дня здароўя: сустрэча з супрацоўнікамі ФАПа "Здоровье прежде всего" (*сельская бібліятэка аграгарадка Сваташыцы*), пазнавальная гульня "Здоровому – все здорово" (*сельская бібліятэка аграгарадка Якубава*), урок здароўя "Для тех, кто хочет быть здоров" (*сельская бібліятэка аграгарадка Сіпішчава*) і інш.

Відэаўрок "Чарнобыльскі бумеранг" (*сельская бібліятэка аграгарадка Станіславова*).

***Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк***

**1 красавіка** Свята гумару "День рождения смеха" (*дзіцячая бібліятэка*).

**2 красавіка** Скайп-канферэнцыя "Яднанне Беларусі і Расіі" для людзей з абмежаванымі магчымасцямі з Лепельскага раённага таварыства інвалідаў і расійскага маладзёжна-інфармацыйнага клуба "Ромашка" з г. Балахна Ніжагародскай вобласці (Расійская Федэрацыя) (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**2 красавіка** Інтэлектуальны марафон "Галерея гоголевских портретов" (*Юркоўшчынская сельская бібліятэка*).

**15 красавіка** Гадзіна гісторыі "И клятву верности сдержали…" у

***Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**6 красавіка** Творчая сустрэча з беларускімі паэтамі *Л. Дранько-Майсюком* і *Э. Акуліным* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**12 красавіка** Літаратурна-музычная кампазіцыя “Весна. Улыбки. Цветы” (*Асвейская гарпасялковая бібліятэка*).

**14 красавіка** Дзень праваслаўнай кнігі “Живое слово мудрости духовной” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**26 красавіка** Свята “Королевство Многочитай” (*дзіцячая бібліятэка*).

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк***

З **1** па **5 красавіка** Тыдзень дзіцячай кнігі, у рамках якога адбыліся: літаратурны калейдаскоп “Падарожжа па Беларусі з Дзедам Барадзедам”, кніжны міні-тэатр на стале “Мы паказваем казку”, тэатралізаванае прадстаўленне “Кніга – лепшы сябра дзяцей”, літаратурны паказ мадэляў “Персанажы любімых твораў” (*Курынская сельская бібліятэка*).

**3 красавіка** супрацоўнікі *Суражскай гарпасялковай бібліятэкі* прынялі ўдзел у навукова-практычнай канферэнцыі “Народнаму подзвігу – памяць і ўдзячнасць пакаленняў”, прысвечанай 70-годдзю вызвалення Беларусі і 100-годдзю з дня нараджэння камандзіра партызанскай брыгады імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамола Д.Ф. Райцава.

**10 красавіка** Экалагічны кнігамаршрут “Казкі бібліятэчнага лесу” для чытачоў малодшага школьнага ўзросту (*Замастоцкая сельская бібліятэка*).

***Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк***

У **красавіку** ў бібліятэках раёна адбыліся наступныя мерапрыемствы:

вечар-сустрэча “Гістарычная повязь” да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі (*цэнтральная раённая бібліятэка*). **2 красавіка** адбылася



Таварыства Чырвонага Крыжа. Студэнтка Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта *Крысціна Мартынава* выступіла перад чытачамі і супрацоўнікамі бібліятэкі з паведамленнем “Артериальная гипертензия. Профилактика атеросклероза”. На працягу ўсяго дня ў бібліятэцы праводзілася акцыя “Измерь свое давление” пры ўдзеле студэнтаў ВДМУ.

**10 красавіка** ў агульнай чытальнай зале абласной бібліятэкі адбылася літаратурна-тэатральная вечарына “Быкаўская праўда вайны”, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы *Васіля Уладзіміравіча Быкава*.

**12 красавіка** ў ДКУ “Віцебская абласная філармонія” супрацоўнікамі агульнай чытальнай залы абласной бібліятэкі ў рамках цыкла канцэртна-пазнавальных праграм для будучых мам “Соткать душу из нот” была праведзена выстава-агляд “Искусство быть мамой”.

**10 красавіка** ў фае бібліятэкі адбылося адкрыццё мастацкай выставы члена Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь *Вячаслава Вячаслававіча Шамшура* “Лазні”.

**10 красавіка** супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры сумесна з валанцёрамі з УА “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава” правялі дабрачынную акцыю для дзяцей УАЗ “Віцебскі абласны спецыялізаваны Дом дзіцяці”.

**15 красавіка** ў аддзеле перыядычнай літаратуры адбылася творчая сустрэча з расійскім гісторыкам-архівістам, пісьменнікам *Аляксандрам Аляксандравічам Чароміным*.

**16 красавіка** ў абласной бібліятэцы адбылася сустрэча з прадстаўнікамі РВУ “Выдавецкі дом «Звязда»” на чале з намеснікам генеральнага дырэктара ўстановы *Алай Генрыхаўнай Корбут*. Прысутным у зале супрацоўнікам бібліятэк вобласці, педагогам, студэнтам ВДУ імя П.М. Машэрава, ідэалагічнаму актыву горада былі прадстаўлены новыя выданні і электронная прэзентацыя пра выдавецкі холдынг.

**22 красавіка** ў абласной бібліятэцы прайшоў семінар “Публічная бібліятэка: новыя магчымасці і прыярытэты развіцця” для дырэктараў гарадскіх і раённых сетак публічных бібліятэк Віцебскай вобласці, у ходзе якога былі падведзены вынікі работы бібліятэк сеткі Міністэрства культуры за 2013 год, агучаны прыярытэты і актуальныя праблемы бібліятэчнай практыкі, яе сувязь з бібліятэчнай адукацыяй.

**23 красавіка** ў бібліятэцы ў рамках праграмы “Свет души рассеет тьму” адбылася творчая сустрэча з віцебскай паэтэсай, членам ГА “Беларускае таварыства інвалідаў па зроку” *Галінай Уладзіміраўнай Пруднікавай* “Струны души”.

***Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк***

**1 красавіка** Літаратурнае свята “Сокровищница мудрости, или Мы праздник начинаем наш…”, прысвечанае 65-годдзю бібліятэкі імя У. Маякоўскага. Удзельнікамі свята сталі чытачы бібліятэкі, навучэнцы каледжа лёгкай прамысловасці і СШ № 30.

**3 красавіка** Адкрыццё выстаўкі акварэлі “Паэзія, якую можна ўбачыць” дацэнта кафедры матэматыкі ВДУ імя П.М. Машэрава Е.І. Куліковай (*бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай*).

**8 красавіка** Адкрыццё экспазіцыі творчых работ *Тамары Сафронаўны Багдановіч* і *Тамары Мікалаеўны Сіманавай* “Души прекрасные порывы” (вышыванкі) (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

З **8** па **10 красавіка** прайшла духоўна-асветніцкая акцыя “Священный дар жизни” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага сумесна з Віцебскай епархіяй БПЦ*). Акцыя была прымеркавана да Сусветнага дня здароўя і праведзена сумесна з епархіяй БПЦ. Да ўдзельнікаў акцыі звярнуўся духоўнік цэнтра мацярынства і сямейных каштоўнасцяў “Умиление” Віцебскай епархіі пратаіерэй *Павел Мацук*, адбылася прэзентацыя выстаўкі “Спасай взятых на смерть, альбо За жизнь нерождённых младенцев”, якую правяла каардынатар накірунку абароны мацярынства, дзяцінства і сямейных каштоўнасцяў Віцебскай



епархіі, кіраўнік цэнтра “Умиление” *Іна Уладзіміраўна Касцюковіч*. На працягу акцыі адбыліся сустрэчы з урачом-гінеколагам жаночай кансультацыі № 3 *Г.Г. Івановай* і псіхолагам *А.А. Акмасавай*.

**22 красавіка** Урок-разважанне “Мая планета – чалавечы дом”, прысвечаны Міжнароднаму дню Зямлі (*дзіцячая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. Гайдара*)

**23 красавіка** Мерапрыемства з цыкла “Спасибо солдатам Победы за то, что не знаем войны”, прысвечанае вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Удзельнікам была прапанавана мультымедыйная прэзентацыя “Марш памяці па месцах баявой славы”, а таксама адбыўся прагляд дакументальна-публіцыстычнай стужкі “Вызваленне Віцебска” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

**24 красавіка** Вусны часопіс “Чарнобыль у нашай памяці”, прысвечаны 28-й гадавіне Чарнобыльскай трагедыі (*бібліятэка імя У. Караткевіча*).

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 красавіка** Літаратурна-паэтычная сустрэча з мясцовымі паэтамі “Поэзия – гостья небесная” (*Барунская сельская бібліятэка*). Мерапрыемства праходзіла ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання для адзінокіх і інвалідаў в. Баруны.

**22 красавіка** адбылася нарада бібліятэчных работнікаў раёна “Дзень прафесійных зносін”. У праграме: дзелавая гульня “Вырашаем прафесійныя пытанні разам”, хвіліна ўзаемаінфармацыі “Мае творчыя знаходкі”, літаратурная гасцёўня “В. Набоков: эмигрант с русской душой” і інш. (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**25 красавіка** ў рамках раённых краязнаўчых бібліятэчных чытанняў “Браслаўская гісторыя: падзеі, факты, людзі” прайшлі: фотавыстаўка “Мясціны, сэрцу дарагія”, этнаграфічны экскурс “З мінулага – у будучыню”, пасяджэнне школы “Я – беларус!” (*Замошская сельская бібліятэка*).